УДК [316.343–058.13+330+323+2–9](091)(476.4–21)"1800/1860"

# САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ, ПАЛІТЫЧНАЕ І КАНФЕСІЙНАЕ ЖЫЦЦЁ МЯШЧАН МАГІЛЁВА (1800–1860 гг.)

*Мядзведзеў Кірыл Аляксандравіч*,
малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі, магістр гістарычных навук (г. Мінск, Беларусь)

11

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*У артыкуле распавядаецца пра сацыяльныя, эканамічныя, палітычныя, ваенныя, канфесійныя, этнічныя і культурныя аспекты жыцця мяшчанства Магілёва ў 1800–1860 гг.*

Мяшчане – гэта асноўная і самая шматлікая група гарадскіх жыхароў. Яны ўдзельнічалі ва ўсіх працэсах, якія працякалі ўнутры горада і былі асноўнай горадаўтвараючай сілай. Аднак расслаенне мяшчанскага асяродку істотна падрывала моц гэтага саслоўя і стварала ўмовы для супрацьстаяння. Гэта датычылася абсалютна ўсіх беларускіх гарадоў XIX ст., у т. л. і Магілёва.

У кожным з населеных пунктаў меліся і свае пэўныя асаблівасці, што выдзялялі горад з шэрагу іншых. Так, палову насельніцтва Магілёва на працягу азначанага перыяду складалі яўрэі, якіх, паводле пастаноў аб «мяжы аселасці», актыўна высялялі з навакольных вёсак. На 1800 г. мяшчан у Магілёве было каля 10 тыс. (у т. л. 5 тыс. яўрэяў), на 1812 г. – 15 тыс. (8 тыс. яўрэяў), на 1825 г. – 11,6 тыс. (6 тыс. яўрэяў), на 1840 г. – 23,1 тыс. (12 тыс. яўрэяў), на 1841 г. – каля 19,7 тыс. (10 тыс. яўрэяў), на 1847 г. – 15 тыс. (каля 7,9 тыс. яўрэяў), на 1859 г. – 25 тыс. (14 тыс. яўрэяў) [3, с. 25]. Яўрэі актыўна запісваліся ў магілёўскае мяшчанства і паступова ўзялі ў свае рукі большую частку гарадской эканомікі. У 1805 г., паводле пастановы Аляксандра I, яны павінны былі выплочваць такі ж падушны падатак, як і мяшчане-хрысціяне. У 1819–1820 і 1823–1825 гг. выйшаў шэраг пастаноў аб забароне выкарыстання яўрэямі працоўных сіл хрысціян, яўрэйскай прапінацыі, арэнд, паштовых збораў і пражывання іўдзеяў у вёсках. Аналагічныя загады выдаў у 1839 г. Мікалай I. Падчас вайны 1812 г. яўрэйскія мяшчане і купцы лаяльна адносіліся да французаў, звязваючы з іх прыходам надзеі на ліквідацыю «мяжы аселасці» [1, с. 92, 106; 2, с. 73–74, 83].

У апісваемы перыяд менавіта купцам і мяшчанам іўдзейскага веравызнання цалкам належаў гандаль Магілёва з шэрагам расійскіх і замежных гарадоў (Рыга, Рэвель, Масква, Санкт-Пецярбург, Смаленск, Кіеў, Адэса, Кёнігсберг, Данцыг і інш.). Таксама яўрэі былі ўласнікамі звыш 100 гарадскіх фабрык і заводаў (па дадзеных на 1860 г.). Так, у 1847 г. купец-мешчанін Шлома Ратнэр заснаваў фабрыку па вытворчасці пянькі. Падчас Крымскай вайны (1853–1856 гг.) магілёўскі мешчанін Восіп Цукерман спекуляваў лесам, а праз некалькі гадоў выкупіў будынак былога палаца Богуша-Сестранцэвіча і перарабіў яго ў сінагогу. За даволі вялікую суму грошай ён нават здолеў набыць ганаровае грамадзянства. Да 1860 г. на прыватныя сродкі яўрэйскіх мяшчан былі адчынены дзве пяньковыя і адна табачная фабрыкі. Таксама яўрэйскія мяшчане падзялілі напалову з хрысціянамі ўладу ў магілёўскім гарадавым магістраце. Так, у 1860 г. з чатырох ратманаў двое былі яўрэямі – Шыман Ноткін і Якаў Драбкін. У 1848 г. Магілёў знаходзіўся на 52-м месцы сярод 69 гарадоў еўрапейскай часткі Расійскай імперыі па велічыні даходаў (13150 руб./год) і на 54-м – па сярэдніх памерах даходаў на аднаго жыхара (71 кап.) [3, с. 24–26; 7, арк. 20–27 адв., 37, 389 адв.; 6, с. 134; 12, с. 90].

Акрамя яўрэяў па нацыянальнай прыкмеце мяшчане Магілёва ў вылучаны перыяд падзяляліся на беларусаў (каля 40%), рускіх, палякаў, немцаў, татар, цыганоў, эстонцаў, латышоў і інш. (усе названыя вышэй – агулам 10%). Яўрэі ў асноўным прытрымліваліся іўдзейскага веравызнання, але фіксаваліся і выпадкі іх пераходу ў праваслаўе, каталіцтва, стараверства, пратэстантызм і нават іслам. Па канфесійнай прыкмеце ў 1800–1860 гг. сітуацыя была наступнай: іўдзеі (каля 50%), праваслаўныя (каля 30%), уніяты (каля 10% да 1839 г.), каталікі (каля 3%), стараабрадцы (каля 1,5%), пратэстанты (каля 0,5%), мусульмане (каля 5%). Аднак працэнтныя суадносіны былі няўстойлівымі і змяняліся па прычыне пераходу некаторымі мяшчанамі (і нават цэлымі групамі) у іншае веравызнанне. Асноўнымі заняткамі магілёўскіх мяшчан у азначаны перыяд былі гандаль, рамёствы, промыслы, сельская гаспадарка, жывёлагадоўля [1, с. 101–104, 107, 124–127; 5, с. 117–118; 7, арк. 355–360].

Адбываліся ў Магілёве і канфлікты рознай ступені вастрыні. Некаторыя з іх прыпалі на ваенныя падзеі (вайну 1812 г., паўстанне 1830–1831 гг. і інш.), яшчэ больш ускладняючы палітычную абстаноўку. У 1802 г. Магілёў быў прызнаны адным з цэнтраў хасідызму (радыкальнага іўдаізму). Адбыліся нават сутыкненні паміж хасідамі і традыцыяналістамі з забітымі, паранена і арыштаванымі [3, с. 25; 7, арк. 10–11]. Падчас франка-расійскай вайны (1805–1807 гг.) магілёўскія мяшчане гвалтаваліся, рабаваліся, істотна ўзраслі падаткі, рэкрутчына, розныя павіннасці, павялічылася колькасць вайсковых пастояў. Асабліва гэта стала адчувальна на працягу ўсяго 1811 г. і ў першай палове 1812 г. 8 ліпеня 1812 г. у Магілёў уступілі французскі корпус маршала Луі Нікаля Даву і польскі атрад генерала Юзафа Панятоўскага. 21 ліпеня мяшчане горада пад пагрозай зброі павінны былі прысягнуць Напалеону. Іх прымушалі штотыднёва пастаўляць харч і фураж, а таксама рэкрутаў у французскую армію і жандармерыю. Кожны «мяшчанскі дым» павінен быў даць 2 пуды сена і саломы, ½ пуда гароху, 5 пудоў жыта і аўса, 15 тыс. руб. з хрысціян і 30 тыс. руб. з іўдзеяў. Аднак мяшчане, сілай мабілізаваныя ў розныя баявыя часткі, папросту разбегліся. Так адбылося, напрыклад, з «палком стражы магілёўскай» колькасцю ў 400 чалавек (ім нават не выдалі зброі), які ў лістападзе 1812 г. здаў рускім каменданта Рамінскага і разышоўся па дамах [2, с. 74; 9, с. 81; 10, с. 93]. Разам з тым па загадзе маршала Даву двое французскіх салдат, якія рабавалі і збівалі мяшчан, былі прылюдна расстраляныя. Аднак мяшчанства Магілёва адмовілася падпарадкоўвацца французам і мясцовай прафранцузскай шляхце. Асаблівага апагея супярэчнасці дасягнулі ў лістападзе 1812 г. падчас адступлення арміі Напалеона. Мяшчане забілі каламі некалькіх шляхціцаў і французскіх салдат, разгрмілі яўрэйскія лаўкі з гарэлкай. Так, «нейкі велізарны дзяціна Аверка» забіў семярых французаў і палякаў, якія збіралі бульбу з яго агарода. Аднак, паводле ўспамінаў магілёўцаў (К. К. Арнольдзі, А. М. Раманоўскі, ігумен Арэст), «французы з большага паводзілі сябе прыстойна… чынілі рабункі і гвалты ў асноўным немцы (вестфальцы, баварцы і інш.)». Мяшчане не далі ворагу спаліць Магілёў і дапамаглі расійскім войскам пад камандаваннем генерал-лейтэнанта Ажароўскага і генерала Шэпелева выгнаць французаў з горада [1, с. 84, 87; 2, с. 70–72; 4, с. 235– 236; 9, с. 81–83; 10, с. 82–83, 93; 11, с. 85, 93].

Ваенныя падзеі прынеслі розныя эпідэміі. Так, у 1812 г. Магілёў ахапіла эпідэмія тыфу. «За Шклоўскай заставаю хавалі па 50 чалавек у адну яму; трупы мяшчане звозілі на вазах за горад». У маі – чэрвені 1831 г. (падчас паўстання 1830–1831 гг.) ад халеры памірала па 30 і болей чалавек штодзённа. Аналагічная хвароба была зафіксавана ў горадзе ў 1848–1849 гг. [1, с. 91, 98–99; 2, с. 74, 88; 4, с. 236; 5, с. 117].

Пасля вайны 1812 г. канфесійныя супярэчнасці ў Магілёве не сціхлі. Так, вясной 1816 г. уніяцкае і каталіцкае мяшчанства рашуча супраціўлялася намерам імперскага ўрада перавесці іх у праваслаўе. Былі нават выпадкі крывавых сутыкненняў, падчас якіх загінула 40 чалавек, а 30 былі арыштаваны і высланы ў Сібір (прычым «без разбора веры и участия в происшедшем»). Аналагічнае здарэнне (праўда, з меншымі ахвярамі) адбылося летам 1822 г. Не абышлася без канфесійных і сацыяльных эксцэсаў у Магілёве і справа ліквідацыі уніяцтва. Так, вясной 1839 г. незадаволенымі было забіта 12 чалавек, у т. л. 6 былых мяшчан-уніятаў і адзін выкрэст (хрышчоны ў праваслаўе іўдзей) [7, арк. 438–442, 460; 8, с. 141]. У 1819–1829 гг. мешчанін Насон Шымановіч Берлін скардзіўся «на обременение его дома двойным воинским постоем». Яго то вызвалялі ад пастояў за плату, то прызначалі новых салдат. Потым высветлілася, што Берлін трымае два дамы адначасова (каменны і драўляны). У 1829 г. міністр унутраных спраў Расіі Арсеній Закрэўскі прадпісаў яму спыніць скаргі пад пагрозай пакарання. У 1832–1839 гг. скаргі мешчаніна Шахны Айзікавіча Іонафана на губернскае кіраўніцтва за нявыплату 550 руб. на рамонт турмы абярнуліся для яго шматгадовым разбіральніцтвам, бюракратычнай валакітай, велізарнымі судовымі выдаткамі і высылкай у Сібір. У 1833 г. спрачаліся хрысціянская і яўрэйская абшчыны Магілёва з-за машчэння дарог на Чавусы і Быхаў. Іўдзеі былі незадаволеныя павышанымі ў два разы коштамі на матэрыялы для бруку [2, с. 83, 91–94].

Такім чынам, жыццё горада і яго насельнікаў у перадрэформенны перыяд было даволі складаным і шматгранным. Нягледзячы на шэраг нявырашаных ключавых пытанняў,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Магілёву ўдалося застацца адным з буйных беларускіх гарадоў, захоўваючы гэты статус да падзей 1917 г.

### Спіс выкарыстанай літаратуры


1. Агееў, А. Р. Магілёўская даўніна ў пытаннях і адказах / А. Р. Агееў, І. А. Марзалюк, І. А. Пушкін. – Магілёў: Абласная друкарня, 1999. – 2-е выд., перапрац. і дап. – 204 с.: іл.
2. Агеев, А. Г. Перекрёстки могилёвской истории / А. Г. Агеев, Я. И. Климуть, И. А. Пушкин. – Минск: Туринфо, 2004. – 214, [1] с.
3. Акулич, М. Могилёв и евреи: История, Холокост, наши дни / М. Акулич. – Минск: Издательские решения, 2018. – 98, [1] с.
4. Арнольди, К. К. Французы в Могилёве-на-Днепре. 1812 г. (Рассказ очевидца) / К. К. Арнольди // Русская старина: Ежем. истор. изд. – СПб., 1873. – Т. VIII. – Вып. 8. – С. 233–237.
5. Бяспанскі, С. І. З побыту гараджан / С. І. Бяспанскі // Памяць: Магілёў: Гіст.-дакум. хроніка гарадоў і р-наў Беларусі. – Мінск, 1998. – С. 114–118.
6. Кіштымаў, А. Гарады і мястэчкі / А. Кіштымаў // Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Мінск, 2005. – Т. 4. – С. 128–137.
7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2109. – Воп. 1. – Спр. 18. – 590 арк.
8. Пинкертон, Р. Могилёв в двадцатых годах прошлого века / Р. Пинкертон // Могилёвская старина: сб. статей «Могилёвских губернских ведомостей». – Могилёв, 1901. – Вып. 2. – С. 138–141.
9. С. К эпохе 1812 года. Из семейных преданий могилёвцев / С. // Могилёвская старина: сб. статей «Могилёвских губернских ведомостей». – Могилёв, 1900. – Вып. 1. – С. 81–83.
10. Сідарэнка, Б. І. У складзе Расійскай імперыі / Б. І. Сідарэнка // Памяць: Магілёў: Гіст.-дакум. хроніка гарадоў і р-наў Беларусі. – Мінск, 1998. – С. 91–95.
11. Філатава, А. Вайна 1812 г. і Беларусь / А. Філатава // Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Мінск, 2005. – Т. 4. – С. 75–86.
12. Яцкевіч, З. Яўрэі ў Магілёве / З. Яцкевіч // Памяць: Магілёў: Гіст.-дакум. хроніка гарадоў і р-наў Беларусі. – Мінск, 1998. – С. 90.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова